ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
26.06.2023 № 177

**Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Святыні роднага краю» для IX–X класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі**

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Святыні роднага краю» (далей – вучэбная праграмма) прызначана для набыцця і сістэматызацыі вучнямі паглыбленых ведаў пра свой край, рэгіён, краіну і выступае ў якасці своеасаблівага «навігатара» па здабычы ведаў, перапрацоўцы інфармацыі і набыцці практыка-арыентаваных уменняў.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на два гады, па 35 гадзін на кожны год і арыентавана на вучняў IX–X класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі. Пры планаванні адукацыйнага працэсу педагагічны работнік можа змяняць колькасць гадзін на вывучэнне той ці іншай тэмы з улікам інтарэсаў і пазнавальных магчымасцей вучняў.

3. Мэта факультатыўных заняткаў – выхаванне гарманічна развітай асобы – чалавека з маральнымі якасцямі, які здольны праявіць сябе ў кантэксце міжкультурнай камунікацыі.

4. Задачы:

фарміраванне ў вучняў ведаў аб матэрыяльных і духоўных адметнасцях роднага краю;

фарміраванне і асэнсаванне каштоўнасных арыенціраў; садзейнічанне развіццю духоўнай культуры вучняў;

фарміраванне ў вучняў патрэбы да самаадукацыі і самавыхавання, умення арыентавацца ў полікультурным асяроддзі;

прапаганда і папулярызацыя матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей;

прывіццё даследчых навыкаў, пашырэнне і паглыбленне інтэлектуальных і пазнавальных магчымасцей вучняў.

5. Рэкамендаваныя формы і метады навучання і выхавання: праца з друкаванымі і электроннымі рэсурсамі, работа ў архівах і бібліятэках, сустрэчы з прадстаўнікамі розных канфесій, творчымі людзьмі, мясцовымі жыхарамі, правядзенне экспедыцый, экскурсій, вандровак, падрыхтоўка рэфератаў, стварэнне прэзентацый, удзел у конкурсах і іншыя формы і метады.

Рэалізацыя дадзенай вучэбнай праграмы патрабуе творчага падыходу, захавання магчымасці мабільнай траекторыі навучання, выбару форм правядзення заняткаў, адбору аптымальных метадаў і прыёмаў навучання і выхавання.

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу падчас рэалізацыі дадзенай вучэбнай праграмы рэкамендуецца выкарыстоўваць метады навучання і выхавання: стымулявання вучэбнай дзейнасці, арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці і кантролю эфектыўнасці вучэбнай дзейнасці. Заняткі праводзяцца ў выглядзе лекцый і практыкумаў. Важнае значэнне пры вывучэнні асобных тэм дадзенай вучэбнай праграмы мае самастойная падрыхтоўка вучняў і праца з рэкамендаванай літаратурай. Практычныя заняткі дазваляюць вучням набыць неабходныя ўменні і навыкі, далучыцца да актыўнай пошукава-даследчай дзейнасці.

Дадзеная вучэбная праграма прадугледжвае правядзенне тэарэтычных і практычных заняткаў.

Тэарэтычныя заняткі – гэта трансляцыя ведаў педагагічнымі работнікамі, запрошанымі лектарамі: спецыялістамі той ці іншай галіны, навукоўцамі, прадстаўнікамі рэлігійных арганізацый, творчымі асобамі, а таксама самастойная работа вучняў з рознымі крыніцамі інфармацыі.

Практычная частка дадзенай вучэбнай праграмы прадстаўляе сабой працу з інфармацыйнымі рэсурсамі, падрыхтоўку і ўдзел у разнастайных мерапрыемствах, стварэнне выніковых прэзентацый, рэфератаў, дакладаў, наведванне аб’ектаў матэрыяльнай і духоўнай культуры, стварэнне промапрадукцыі (даведнікаў, відэаролікаў, фотаздымкаў, літаратурных замалёвак і гэтак далей).

6. У выніку засваення дадзенай вучэбнай праграмы вучні павінны:

набыць новыя веды, вывучэнне якіх не прадугледжана вучэбнымі праграмамі па вучэбных прадметах;

паглыбіць веды па гісторыі і культуры малой радзімы, рэгіёна, краіны;

авалодаць уменнямі і навыкамі аналізаваць і сістэматызаваць краязнаўчы матэрыял з выкарыстаннем інфармацыйных матэрыялаў і камунікацыйных тэхналогій;

умець арыентавацца ў патоку інфармацыі, рабіць высновы;

мець магчымасць удзельнічаць у краязнаўчых конкурсах.

Формамі падвядзення вынікаў рэалізацыі дадзенай вучэбнай праграмы з’яўляюцца: мультымедыйныя прэзентацыі, праекты, справаздачы, удзел у конкурсах.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ
## ПЕРШЫ ГОД НАВУЧАННЯ

Вучэбна-тэматычны план

| № п/п | Тэма | Колькасць гадзін (усяго) | З іх | |
|---|---|---|---|---|
| | | | тэарэтычныя | практычныя |
| 1 | Уводзіны | 1 | 1 | |
| 2 | Спадчына роднага краю | 2 | 1 | 1 |
| 3 | Сусветная спадчына ЮНЕСКА | 2 | 1 | 1 |
| 4 | Помнікі матэрыяльнай культуры | 6 | 3 | 3 |
| 5 | Духоўная культура | 6 | 3 | 3 |
| 6 | Славутыя землякі | 4 | 3 | 1 |
| 7 | Рэлігійна-асветніцкія дзеячы Беларусі | 4 | 2 | 2 |
| 8 | Страчаная спадчына | 3 | 2 | 1 |
| 9 | Правядзенне экспедыцый, экскурсій, вандровак | 5 | 2 | 3 |
| 10 | Падвядзенне вынікаў работы | 2 | | 2 |
| | УСЯГО | 35 | 19 | 17 |

Уводзіны (1 гадзіна)

Асаблівасці арганізацыі заняткаў. Краязнаўства як комплекснае даследаванне свайго краю. Суадносіны беларусазнаўства і краязнаўства. Аб’ект, прадмет і метады краязнаўчых даследаванняў.

Спадчына роднага краю (2 гадзіны)

Турысцка-краязнаўчыя магчымасці малой радзімы, рэгіёна, краіны. Помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры мясцовага і дзяржаўнага значэння. Гісторыка-культурная спадчына. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб культуры. Старажытныя цэнтры культуры – Полацк, Мінск, Тураў, Слуцк і інш. Малая радзіма ў гісторыі краіны.

Практычная работа

Складанне гістарычнай даведкі пра населены пункт. Правядзенне сустрэч з мясцовымі краязнаўцамі, наведванне музеяў устаноў адукацыі і культуры. Стварэнне інфармацыйна-даведачных матэрыялаў.

Сусветная спадчына ЮНЕСКА (2 гадзіны)

Канвенцыя аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ад 16 лістапада 1972 года. Статус аб’екта Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Аб’екты Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА ў Беларусі. Белавежская пушча, Мірскі замак. Геадэзічная дуга Струвэ. Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс.

Практычная работа

Збор інфармацыі аб аб’ектах Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА на тэрыторыі Беларусі. Стварэнне прэзентацыі «Сусветная спадчына ЮНЕСКА ў Беларусі», прэзентацыя работы на мерапрыемствах установы адукацыі.

Помнікі матэрыяльнай культуры (6 гадзін)

Помнікі драўлянага і каменнага дойлідства. Палацы і сядзібы (Каралеўскі палац (г. Гродна), палац Румянцавых-Паскевічаў (г. Гомель), Архіепіскапскі палац (г. Магілёў), Косаўскі палац, палац у Жылічах, сядзіба Агінскіх і гэтак далей). Замкі Беларусі (Мірскі, Лідскі, Крэўскі, Навагрудскі, Любчанскі, Быхаўскі і гэтак далей). Культавыя забудовы (Мікалаеўская царква (г. Магілёў), царква святога Міхаіла (в. Сынкавічы), Сафійскі сабор, Каложская царква, касцёл Святога Яна Хрысціцеля (в. Камаі), Станіслаўскі касцёл, Сар’янскі касцёл (Верхнядзвінскі раён), мячэць (г. Іўе), сінагога (г. Быхаў) і гэтак далей). Ваенна-гістарычныя аб’екты (мемарыяльны комплекс «Хатынь», манумент у гонар Маці-патрыёткі (г. Жодзіна), мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой», помнік Перамогі 1812 г. (г. Кобрын) і гэтак далей). Гаспадарчыя, рамесніцкія і вытворчыя аб’екты мясцовасці (свіраны, вяндлярні, лядоўні, лямусы, стайні, кавярні, бровары, кузні, плавільні, цагельні, млыны, паперні, гуты, ставы і водныя каналы, ваданапорныя вежы, паштовыя станцыі, чыгуначныя шляхі і станцыі і іншыя аб’екты).

Практычная работа

Праца з краязнаўчай літаратурай, інфармацыйнымі рэсурсамі. Складанне даведкі аб вывучаемых аб’ектах мясцовасці. Складанне экскурсійна-краязнаўчых маршрутаў (у тым ліку тэматычных). Стварэнне прэзентацыйных матэрыялаў.

Духоўная культура (6 гадзін)

Аб’екты вусна-паэтычнай і літаратурнай творчасці. Мясцовыя абрады, традыцыі і звычаі. Храмы. Музеі і іншыя ўстановы культуры. Мастацкая самадзейнасць.

Практычная работа

Наведванне храмаў. Правядзенне экскурсій ў музеі, наведванне ўстаноў культуры, адметных мясцін духоўнай культуры. Сустрэчы з мясцовымі святарамі, творчыя сустрэчы з пісьменнікамі, паэтамі, мастакамі. Стварэнне відэаролікаў, фотаматэрыялаў.

Славутыя землякі (4 гадзіны)

Дзяржаўныя, палітычныя, грамадскія, ваенныя дзеячы, мецэнаты, дзеячы культуры, навукі і іншыя выбітныя асобы краю. Землякі, якія зрабілі значны ўнёсак у культурную,

грамадскую, палітычную дзейнасць краіны, рэгіёна, малой радзімы ў розныя гістарычныя перыяды.

Практычная работа

Збор інфармацыі аб знакамітых земляках свайго рэгіёна. Аналіз навуковай, даведачнай літаратуры, архіўных дадзеных, матэрыялаў інтэрнэт-рэсурсаў. Апытанне мясцовых жыхароў (пры неабходнасці). Даследаванне і аналіз сабранага матэрыялу. Афармленне даследчага матэрыялу.

Рэлігійна-асветніцкія дзеячы Беларусі (4 гадзіны)

Еўфрасіння Полацкая, Кірыл Тураўскі, Сімяон Полацкі, Францыск Скарына, Сымон Будны, Іван Фёдараў, Пётр Мсціславец, Васіль Цяпінскі, Лаўрэнцій і Стэфан Зізаніі, браты Мамонічы, Мялецій Сматрыцкі, Спірыдон Собаль, Георгій Канінскі, Ілья Капіевіч і іншыя дзеячы. Іх жыццё, дзейнасць і роля ў гісторыі царквы, дзяржавы.

Практычная работа

Напісанне рэфератаў пра жыццё і дзейнасць рэлігійна-асветніцкіх дзеячаў Беларусі. Стварэнне мультымедыйных прэзентацый.

Страчаная спадчына (3 гадзіны)

Аб'екты матэрыяльнай і духоўнай культуры мясцовасці, якія зараз не існуюць. Збор інфармацыі аб страчанай матэрыяльнай альбо духоўнай спадчыне свайго рэгіёна. Праца з навуковай, даведачнай літаратурай, архіўнымі дадзенымі, матэрыяламі інтэрнэт-рэсурсаў і гэтак далей. Апытанне мясцовых жыхароў. Зруйнаваныя святыні. Свята-Пакроўская царква (архірэйскае падвор'е, г. Мінск), Свята-Казанская (Чыгуначная) царква (г. Мінск), Свята-Петра-Паўлаўскі кафедральны сабор (г. Мінск), Свята-Георгіеўская царква (г.п. Смілавічы), Фара Вітаўта (г. Гродна) і гэтак далей.

Практычная работа

Апрацоўка матэрыялу аб страчанай матэрыяльнай альбо духоўнай спадчыне свайго рэгіёна, аналіз і афармленне справаздачнага матэрыялу па выніках даследавання аб'екта (аб'ектаў) страчанай спадчыны. Прапагандыская дзейнасць праз сродкі масавай інфармацыі, інтэрнэт-рэсурсы, культурна-асветніцкія мерапрыемствы і гэтак далей.

Правядзенне экспедыцый, экскурсій, вандровак (5 гадзін)

Арганізацыя і правядзенне тэматычных экспедыцый, экскурсій, вандровак.

Падвядзенне вынікаў (2 гадзіны)

Прэзентацыя выніковых матэрыялаў, удзел у краязнаўчых конкурсах, стварэнне промапрадукцыі.

ДРУГІ ГОД НАВУЧАННЯ

Вучэбна-тэматычны план

| № п/п | Тэма | Колькасць гадзін (усяго) | З іх | |
|---|---|---|---|---|
| | | | тэарэтычныя | практычныя |
| 1 | Уводзіны | 2 | 1 | 1 |
| 2 | Гісторыя ўзнікнення канфесій на тэрыторыі Беларусі | 3 | 2 | 1 |
| 3 | Помнікі сакральнай архітэктуры | 3 | 1 | 2 |
| 4 | Помнікі гісторыі і культуры роднага краю | 6 | 3 | 3 |
| 5 | Помнікі археалогіі | 6 | 3 | 3 |
| 6 | Дакументальныя помнікі | 4 | 3 | 1 |
| 7 | Беларускія святыні | 5 | 3 | 2 |
| 8 | Святыя зямлі Беларускай | 4 | 2 | 2 |
| 9 | Абагульняючыя заняткі | 2 | 1 | 1 |
| | УСЯГО | 35 | 19 | 16 |

Уводзіны (2 гадзіны)

Святыні роднага краю. Адметнасці матэрыяльнай і духоўнай культуры. Асаблівасці арганізацыі пошукавай і даследчай работы. Краязнаўчыя крыніцы даследавання (рэчавыя, пісьмовыя, аўдыёвізуальныя і іншыя крыніцы).

Гісторыя ўзнікнення канфесій
на тэрыторыі Беларусі (3 гадзіны)

Дахрысціянскі перыяд, хрысціянізацыя, праваслаўе і каталіцызм, уніяцтва, рэфармацыя і контррэфармацыя. Іўдаізм, іслам на Беларусі. Канфесійныя культавыя збудаванні. Рэлігійныя традыцыі і абрады. Гісторыя станаўлення канфесіянальнай структуры на дадзенай тэрыторыі. Канфесійны склад насельніцтва роднага краю.

Практычная работа

Напісанне рэфератаў па гісторыі станаўлення той ці іншай канфесіі на дадзенай тэрыторыі. Стварэнне даведнікаў па канфесійнаму складу насельніцтва мясцовасці, аналіз колькаснага і якаснага складу насельніцтва мясцовасці са складаннем графікаў, дыяграм, табліц і гэтак далей.

Помнікі сакральнай архітэктуры (3 гадзіны)

Помнікі сакральнай архітэктуры розных канфесій. Культавыя збудаванні (праваслаўныя, каталіцкія, пратэстанцкія, уніяцкія, мусульманскія, іудзейскія і іншыя збудаванні) і іх адрозненні. Архітэктурныя стылі. Фарміраванне самабытнага характару культавага дойлідства Беларусі.

Практычная работа

Стварэнне тэматычных прэзентацый з выкарыстаннем прапанаваных культавых збудаванняў (тэмы прэзентацый выбіраюцца самастойна).

Культавыя збудаванні: Касцёл Сымона і Алены (г. Мінск), Свята-Мікольскі жаночы манастыр (г. Магілёў), Сафійскі сабор, касцёл Прасвятой Троіцы (в. Ішкалдзь, Баранавіцкі раён), касцёл Ушэсця Найсвяцейшай Дзевы Марыі (г. Пінск), Свята-Богаяўленскі мужчынскі манастыр (г. Полацк), Свята-Успенскі жаночы манастыр (г. Орша), касцёл Святога Яна Хрысціцеля (в. Камаі, Пастаўскі раён), Сар’еўскі касцёл (Верхнядзвінскі раён), Свята-Пакроўская царква (в. Карма, Добрушскі раён), Спаса-Праабражэнская царква (г. Чачэрск), касцёл езуітаў (в. Юравічы, Калінкавіцкі раён), Свята-Міхайлаўская царква (в. Сынкавічы, Зельвенскі раён), Свята-Раства-Багародзіцкая царква (в. Мураванка, Шчучынскі раён), Кальвінскі збор (г. Смаргонь), мячэць (г. Іўе), Лютэранская кірха (Гродна), касцёл Святога Станіслава (г. Магілёў), Успенскі манастыр (в. Пустынкі, Мсціслаўскі раён), касцёл бернардзінцаў (в. Будслаў, Мядзельскі раён), Спаса-Праабражэнская царква (г. Заслаўе), Васкрасенскі сабор (г. Барысаў), Свята-Духаўскі кафедральны сабор (г. Мінск), Свята-Петра-Паўлаўская царква (г. Мінск), касцёл Найсвяцейшай Дзевы Марыі (г. Мінск), Барысаглебская царква (г. Гродна), Жыровіцкі Свята-Успенскі мужчынскі манастыр, Харальная сінагога (г. Гродна) і іншыя збудаванні.

Помнікі гісторыі і культуры роднага краю (6 гадзін)

Помнікі гісторыі сваёй мясцовасці. Іх гістарычнае, культурнае і навуковае значэнне. Гістарычная даведка. Стварэнне каталога аб’ектаў. Стварэнне промапрадукцыі (даведнікаў, відэаролікаў, фотаздымкаў і гэтак далей). Удзел у рэгіянальных і рэспубліканскіх краязнаўчых конкурсах.

Практычная работа

Правядзенне экскурсій, сустрэча з мясцовымі краязнаўцамі і жыхарамі, запіс успамінаў, апрацоўка матэрыялу, праца ў архівах, бібліятэках, з дакументамі мясцовых храмаў. Складанне картасхемы з нанясеннем помнікаў гісторыі мясцовасці. Напісанне навукова-даследчых работ. Праца над стварэннем промапрадукцыі.

Помнікі археалогіі (6 гадзін)

Віды помнікаў археалогіі. Стаянкі, гарадзішчы, селішчы. Палеалітычныя стаянкі на тэрыторыі Беларусі (Бердыжская, Юравіцкая). Барысавы камяні, Рагвалодаў камень,

каменныя крыжы. Археалагічны музей «Бярэсце». Гісторыка-археалагічная экспазіцыя «Старажытны Тураў». Месцазнаходжанне. Адметнасці. Рэгіянальны некропаль (курганы, капліцы-пахавальні, помнікі і гэтак далей).

Практычная работа

Правядзенне экспедыцый, экскурсій. Выяўленне і апісанне археалагічных помнікаў мясцовасці (пры наяўнасці). Праца з краязнаўчай літаратурай, інфармацыйнымі рэсурсамі. Складанне даведкі аб археалагічных аб’ектах мясцовасці. Стварэнне прэзентацыйных матэрыялаў.

Дакументальныя помнікі (4 гадзіны)

Летапісы (Полацкі, Смаленскі, Аўрамскі, Радзівілаўскі, Валынскі кароткі летапіс, Летапісы вялікіх князёў літоўскіх, Беларуска-літоўскі летапіс, Баркулабаўскі, Віцебскі летапіс), хронікі (Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага, Быхаўца, Магілёўская, Вялікая хроніка), старадрукі. Перыяд стварэння. Акрэсленыя падзеі. Адметнасці. Месцазнаходжанне.

Практычная работа

Наведванне бібліятэк, архіваў. Праца з краязнаўчай літаратурай, інфармацыйнымі рэсурсамі. Напісанне рэфератаў, стварэнне прэзентацый.

Беларускія святыні (5 гадзін)

Паняцце «святыня». Крыж Еўфрасінні Полацкай. Цудатворныя іконы (іконы Божай Маці: Мінская, Баркалабаўская, Жыровіцкая, Чанстахоўская, Купяціцкая, Будслаўская, Барунская, Тракельская і іншыя іконы). Мошчы святых. Магілы святых. Святыя крыніцы. Манастыры. Рукапісныя Евангеллі (Тураўскае, Аршанскае, Полацкае, Друцкае, Лаўрышаўскае, Мсціжскае, Жыровіцкае, Шарашоўскае) і іншыя Евангеллі.

Практычная работа

Збор інфармацыі пра святыні свайго краю. Даследаванне мясцовых паданняў (апытанне жыхароў) пра цудадзейныя з’явы. Экскурсіі па святых месцах (да святых крыніц, ікон і гэтак далей).

Святыя зямлі Беларускай (4 гадзіны)

Праслаўленне (кананізацыя). Сабор беларускіх святых. Беларускія Святыя: Еўфрасіння Полацкая, Кірыл Тураўскі, Елісей Лаўрышаўскі, Сімяон Полацкі, Юліянія Альшанская, Сафія Слуцкая, Георгій Магілёўскі, Афанасій Брэсцкі, Валянціна Мінская, св. Казімір, Пауліна Баравік, Андрэй Баболя, Рафаіл Каліноўскі і іншыя святыя.

Практычная работа

Збор і аналіз навуковай, даведачнай літаратуры, матэрыялаў інтэрнэт-рэсурсаў аб беларускіх святых. Стварэнне прэзентацыйнага матэрыялу «Святыя зямлі Беларускай».

Абагульняючыя заняткі (2 гадзіны)

Правядзенне краязнаўчай канферэнцыі, арганізацыя выставы, удзел у краязнаўчых конкурсах.